УДК 629.735

# Крыніцы гісторыі Мінскага гета

Тукала С.М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Па шматлікіх аспектах праблемы генацыду і барацьбы яўрэяў у Мінскім гета існуюць як неапублікаваныя архіўныя матэрыялы, так і разнастайныя апублікаваныя крыніцы.

Найбольш істотнымі і змястоўнымі з'яўляюцца дакументы фондаў 4п, 378, 391, 408, 393, 861, 3500, 4683 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія тычацца абставін стварэння і арганізацыі Мінскага гета, асаблівасцяў яго існавання, умоў пражывання вязняў і іх узаемаадносін з акупантамі, метадаў знішчэння яўрэйскага насельніцтва, ролі і галоўных функцый яўрэйскага камітэта г. Мінска, дэпартацыі замежных яўрэяў у "зондэргета" сталічнага гета, афармлення і дзейнасці падполля на тэрыторыі лагера і г.д.

Дадзеныя матэрыялы можна класіфікаваць на дзве групы архіўных крыніц: 1) арганізацыйна-распарадчая дакументацыя органаў нямецкага акупацыйнага кіравання і вярхоўнага камандавання Германіі - паведамленні, аператыўныя зводкі, пастанаўленні, пісьма, пратаколы, даклады, агляды, службовыя запіскі. 2) неапублікаваныя акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследванню і ўстанаўленню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Апублікаваныя крыніцы па праблеме генацыду і барацьбы яўрэяў у Мінскім гета падзяляюцца на наступныя групы:

1) матэрыялы справаводства (уключаюць апублікаваныя акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследванню злачынстваў акупантаў, дакументы праціўніка – планы, загады, справаздачы, распараджэнні ўрадавых органаў і вышэйшага камандавання Трэцяга Рэйха);

2) статыстычныя матэрыялы (характарызуюцца паўнатой, дакладнасцю, наяўнасцю масавых і колькасных дадзеных);

3) крыніцы асабістага паходжання (дзеннікі, успаміны, пісьма сведкаў Халакосту і жудаснай палітыкі генацыду яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны);

4) літаратурныя і публіцыстычныя творы (маюць багатую дакументальную аснову і насычаны цікавымі гістарычнымі фактамі);

5) перыядычны друк (абагульненыя, базісныя звесткі аб генацыду яўрэяў у Мінскім гета).